Грамадзяне Беларускай ССР маюць усю паўнату сацыяльна-эканамічных, палітычных і асабістых правоў і свабод, якія абвешчаны і гарантуюцца Канстытуцыяй СССР, Канстытуцыяй Беларускай ССР і савецкімі законамі. Сацыялістычны лад забяспечвае расшырэнне правоў і свабод, пастаяннае паляпшэнне ўмоў жыцця грамадзян па меры выканання праграм сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця.

(З праекта Канстытуцыі БССР, арт. 37).

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 13 (1200) ● 13 красавіка 1978 г. Цана 2 кап.

## У ПАРТКОМЕ

Партыйны камітэт універсітэта прыняў рашэнне правесці 31 жніўня г.г. агульнаўніверсітэцкае пасвячэнне ў студэнты першакурснікаў. Ужо распрацаван прыкладны план гэтага свята. Ён складаецца з урачыстай часткі, канцэрта мастацкай самадзейнасці, спартыўных выступленняў і г. д. Кожны факультэт павінен будзе выпусціць да гэтага дня насценгазету адпаведнай тэматыкі.

Мяркуецца, што правядзенне дня пасвячэння ў студэнты ў нашай навучальнай установе, як і ў вядучых ВНУ краіны, стане традыцыйным.

## ПРЫСВЕЧАНАЯ ДНЮ ПЕРАМОГІ

5 красавіка 1978 года бібліятэка (аддзел абслугоўвання) сумесна з гістарычным факультэтам правялі канферэнцыю чытачоў, прысвечаную 33-й гадавіне з дня перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, па кнізе І. Р. Новікава «Бессмяротнасць Мінска».

У госці да студэнтаў прыйшлі ветэраны вайны І. Р. Новікаў — аўтар кнігі і Г. В. Суслава. Канферэнцыю адкрыў кандыдат гістарычных навук, дацэнт І. В. Марчанка.

На канферэнцыі з цікавымі дакладамі — «Камуністы — стваральнікі Мінскага камуністычнага падполля, арганізатары яго дзейнасці ў канцы 1941 — пачатку 1942 гг.», «Дзейнасць Мінскага камуністычнага падполля на першым этапе яго барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі», «Самаадданая барацьба з ворагам мінскіх падпольшчыкаў на другім этапе дзейнасці Мінскага камуністычнага падполля», «Мінскія маладагвардзейцы ў барацьбе з ворагам», «Удзел мінскіх падпольшчыкаў у вызваленні і аднаўленні народнай гаспадаркі горада ў 1944—1945 гг.» выступілі студэнты К. Краўцэвіч, І. Іньшына, В. Дзямідчык, Л. Апарына, А. Салаўёў.

З вялікай цікавасцю былі праслуханы выступленні аўтара кнігі І. Р. Новікава, удзельніцы Мінскага падполля Г. В. Суславай і кандыдата гістарычных навук, дацэнта Л. А. Міхайлоўскага.

На канферэнцыі дзейнічала кніжная выстаўка «Бессмяротнасць Мінска». Гасцям канферэнцыі былі ўручаны кветкі і падарункі.

А. РУКШЫН.

## КЛОПАТ: АХОВА ПРЫРОДЫ

У канцы сакавіка савет геаграфічнага таварыства Беларусі, Рэспубліканскі савет таварыства аховы прыроды Беларусі разам з дэканатам геаграфічнага факультэта нашага універсітэта правялі канферэнцыю, прысвечаную вынікам навукова-даследчай работы за 1977 год.

З уступным словам выступіў прэзідэнт геаграфічнага таварыства БССР прафесар В. А. Жучкевіч. З дакладамі на пленарным пасяджэнні выступілі: намеснік старшыні Рэспубліканскага савета таварыства аховы прыроды БССР С. А. Канстанціновіч, прафесар МДУ А. М. Шульгін, кандыдат тэхнічных навук БелНДІП горадабудаўніцтва В. Г. Валабуеў, кандыдат геаграфічных навук БДУ В. Я. Крышчановіч.

Канферэнцыя працягвала сваю работу па секцыях аховы ландшафтаў, аховы вод і паветра, аховы глеб і нетраў.

В. БАРУШКА.

## УВАГА: КОНКУРС!

Прафком і рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» аб'яўляюць конкурс на лепшы матэрыял аб прафсаюзным жыцці універсітэта.

Тэматыка і жанры — разнастайныя. Гэта могуць быць матэрыялы аб прафсаюзным жыцці факультэта, аб прафсаюзнай групе, аб лепшых прафоргах універсітэта, камсамольскіх актывістах, а таксама аб культурна-масавай і спартыўнай рабоце, аб вольным часе студэнтаў, аб рабоце ў інтэрнатах, аб інтэрнацыянальным выхаванні.

Конкурс праводзіцца з 14 красавіка па 1 чэрвеня г. г. Матэрыялы здаваць у прафком універсітэта (геафак, п. 4) з адзнакай «На конкурс». Лепшыя матэрыялы будуць апублікаваны ў газеце «Беларускі універсітэт». Пераможцы будуць узнагароджаны граматамі прафкома і каштоўнымі падарункамі.

### Адабраем праект новай Канстытуцыі БССР

# «Я — ГРАМАДЗЯНІН СССР»

Для першакурснікаў геафака кафедра агульнага землязнаўства арганізавала дыспут: «Я — грамадзянін СССР», на якім студэнты і супрацоўнікі кафедры абмеркавалі праект новай Канстытуцыі БССР.

З жывой цікавасцю прынялі першакурснікі ўдзел у дыспуце, таму што на ім узнімаліся пытанні, блізкія кожнаму з нас. Гаварылі аб нашым праве на адукацыю, аб тым, што быць студэнтам БДУ — вялікі гонар, і таму неабходна заўсёды памятаць аб маральнай адказнасці кожнага за права насіць званне студэнта.

Многа меркаванняў было выказана аб маральным обліку савецкага студэнта. Але ўсе яны зводзіліся да таго, што савецкі студэнт — гэта самаадданы грамадзянін краіны, гэта актывіст, выдатнік вучобы, арганізатар.

У спрэчках аб аўтарытэце чалавека не пазнаць было нашых «ціхіх» А. Смарчкова і У. Грозава — так цікава і грунтоўна абаранялі яны свае погляды.

Да позняга вечара не заціхалі спрэчкі. Мы даведаліся шмат цікавага аб жыцці нашай краіны, аб навуцы. А яшчэ дыспут дапамог нам лепш пазнаць сяброў-студэнтаў і бліжэй пазнаёміцца з нашымі выкладчыкамі В. П. Якушкай, В. А. Барушка, Л. У. Мар'інай, В. А. Калечыцам.

Новыя, цікавыя дыспуты чакаюць нас наперадзе.

А. АКСЁНЕНКА,
студэнт І курса геафака.

# ПРЫКЛАД ДЭМАКРАТЫІ

У Савецкі Саюз я прыехаў з Лівана, каб паглыбіць свае веды. І вось ужо хутка будзе год, як жыву ў беларускай сталіцы — Мінску. Мільёны грамадзян Савецкай Беларусі ў гэтыя дні прымаюць удзел у абмеркаванні праекта новай Канстытуцыі БССР, уносяць свае прапановы і дзеляцца ўражаннямі. Гэта і ёсць яскравы прыклад высокай сацыялістычнай дэмакратыі, якая дала магчымасць народу ўдзельнічаць у вырашэнні ўсіх пытанняў, што датычаць развіцця грамадства.

Нядаўна я і мае сябры з вялікай цікавасцю пазнаёміліся з праектам новай Канстытуцыі БССР. Гэты дакумент — сведчанне вялікіх клопатаў партыі і ўрада аб далейшым паляпшэнні дабрабыту людзей, росквіце адной з раўнапраўных рэспублік Краіны Саветаў.

Буржуазныя ідэолагі шэрагу капіталістычных краін сцвярджаюць, нібыта ў Савецкім Саюзе і ў краінах сацыялістычнага лагера ўшчымляюцца правы чалавека. Я хаця і пражыў у Савецкім Саюзе параўнальна невялікі тэрмін, але асабіста ўпэўніўся ў хлуслівасці такіх сцвярджэнняў.

Маю ўвагу ў праекце Канстытуцыі прыцягнула, па-першае, тое, што шырокія масы насельніцтва ўдзельнічаюць у стварэнні новай Канстытуцыі. Па-другое, што народ прымае Канстытуцыю не толькі як Асноўны Закон краіны, які абараняе правы грамадзяніна, але і як Асноўны Закон жыцця, які забяспечвае выдатныя ўмовы для ўсебаковага развіцця кожнага чалавека.

Кожны грамадзянін Беларускай ССР валодае ўсёй паўнатой не толькі сацыяльна-эканамічных, але і палітычных, асабістых правоў і свабод, абвешчаных і гарантаваных Канстытуцыяй Беларускай ССР і савецкімі законамі. І гэта не проста словы. Здарылася так, што я цяжка захварэў. Мне было аказана бясплатнае лячэнне, забяспечана кваліфікаваная медыцынская дапамога. За ўвесь час хваробы я адчуваў клопаты і ўвагу.

Разам са мной у добраўпарадкаваным інтэрнаце жывуць і савецкія студэнты. Большасць з іх — дзеці сялян і рабочых. Усе яны бясплатна атрымліваюць вышэйшую адукацыю.

Мне і маім сябрам з розных краін свету ў беларускай сталіцы створаны ўсе ўмовы для атрымання трывалых ведаў. Мы займаемся ў добра абсталяваных аўдыторыях і кабінетах. Кожны дзень мы бачым і адчуваем тую гарачую падтрымку ўсяго савецкага народа, якую ён скіроўвае на дапамогу краінам, што змагаюцца за свабоду, свае нацыянальныя правы. Гэта яшчэ раз пераконвае мяне ў тым, што Савецкі Саюз з'яўляецца надзейнай апорай міру на зямлі.

ТАХА АЛЬ-МУЦЫ,
ліванскі студэнт падрыхтоўчага факультэта БДУ.

# УСЕ НА СУБОТНІК!

Камсамольцы універсітэта, як і ўсе працоўныя рэспублікі, з вялікім уздымам і працоўным энтузіязмам уключыліся ў традыцыйнае свята працы — Усесаюзны ленінскі суботнік.

Суботнік павінен прайсці на высокім узроўні, таму так старанна рыхтаваліся да яго. З гэтай мэтай створаны ва універсітэце штаб суботніка, які кіруе работай факультэтаў. На сваіх пасяджэннях ён неаднаразова абмяркоўваў планы арганізацыі суботніка.

У камітэце камсамола распрацаваны планы, вызначаны аб'ём работ суботніка, у якім прымуць удзел усе камсамольцы універсітэта.

Ужо зараз некаторыя факультэты пачалі ўдарную працу ў фонд суботніка. Так, студэнты геаграфічнага факультэта працуюць на геастанцыі «Валожын», а студэнты-біёлагі — у вучэбна-вопытнай гаспадарцы ў Шчомысліцы. А вось студэнты факультэта журналістыкі ўжо з сакавіка працуюць на добраўпарадкаванні новага вучэбнага корпуса па вул. Маскоўскай.

Шмат работы будзе і ў жылых інтэрнатах.

Вялікую дапамогу аказваюць студэнты і дарожна-эксплуатацыйнаму ўчастку Маскоўскага раёна. З 1 красавіка групы па 100—150 чалавек пачалі работу па добраўпарадкаванню вуліц горада. Тут заняты студэнты факультэтаў: радыёфізікі і электронікі, юрыдычнага, хімічнага.

Не застануцца ўбаку і супрацоўнікі універсітэта, якіх таксама чакае немалая работа. Так, выкладчыкі кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў будуць працаваць у купалаўскім запаведніку «Вязынка».

Т. АЗАРЭВІЧ,
Н. МАРКЕВІЧ.





6 красавіка адбылася справаздачная канферэнцыя групы народнага кантролю БДУ.

НА ЗДЫМКАХ: у час канферэнцыі.

Фота В. ДРАЧОВА.




# Механіка - матэматычны факультэт

Механіка-матэматычны факультэт — адзін з самых буйных факультэтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. На факультэце вучыцца каля дзвюх тысяч студэнтаў, з іх 1500 на дзённым аддзяленні. Прафесарска-выкладчыцкі састаў факультэта складае 102 чалавекі, сярод іх: 8 прафесараў і дактароў навук, 40 дацэнтаў і кандыдатаў фізіка-матэматычных навук. Агульную і спецыяльную падрыхтоўку студэнтаў здзяйсняюць 8 кафедр факультэта.

Выкладчыкі факультэта вядуць вялікую навукова-даследчую і навукова-метадычную работу. За апошнія 7 год супрацоўнікі факультэта апублікавалі каля 600 навуковых артыкулаў і 40 кніг — манаграфій, вучэбных дапаможнікаў і метадычных распрацовак. Да навуковай працы прыцягваюцца і студэнты. На першых двух курсах яны прымаюць удзел у рабоце студэнцкіх навуковых гурткоў, а на старэйшых курсах — у вучэбных і навукова-даследчых семінарах. Напісаўшы тры курсавыя работы, на пятым курсе студэнты атрымліваюць магчымасць прымяніць свае веды і здольнасці пры напісанні дыпломнай работы.

Вялікую работу праводзіць факультэт па ўдасканаленню вучэбнага працэсу як па яго зместу, так і па форме. Навукова-метадычны факультэцкі семінар займаецца ўдасканальваннем вучэбных праграм з мэтай адлюстравання ў іх патрабаванняў сучаснай навукі і яе прылажэнняў і, з другога боку, увязвае іх з новымі праграмамі сярэдняй школы.

Сур'ёзнай праблемай механіка-матэматычнага факультэта становіцца забеспячэнне якаснага набору студэнтаў на першы курс. За апошнія гады прыём студэнтаў на матэматычныя факультэты ўзрос у два разы. Каб прыцягнуць ва універсітэт дастатковую колькасць абітурыентаў, здольных займацца матэматыкай, механіка-матэматычны факультэт праводзіць вялікую работу. Пры факультэце працуе школа юных матэматыкаў. Штогод праводзіцца алімпіяда сумесна з рэдакцыяй газеты «Знамя юности». Выкладчыкі факультэта прымаюць удзел у правядзенні раённых, гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх матэматычных алімпіяд. У рабоце па падрыхтоўцы новага набору ўдзельнічаюць і студэнты. Пры правядзенні алімпіяды праз газету «Знамя юности» амаль усе студэнты факультэта напісалі пісьмы сваім школьным выкладчыкам з просьбай прыцягнуць да ўдзелу ў алімпіядзе і да паступлення ва універсітэт сваіх вучняў. Студэнты выступаюць з лекцыямі аб універсітэце перад вучнямі ў час зімовых канікулаў.

А. ФЯДЭНКА,
прафесар, дэкан механіка-матэматычнага факультэта.

# Свята кемлівых і дапытлівых

Сёння ўжо ніхто са студэнтаў не памятае, калі упершыню святкавалі дні мехмата. Але не гэта галоўнае. Галоўнае, што дні мехмата атрымалі прызнанне шырокіх студэнцкіх мас і набылі вядомасць не толькі ў нашым універсітэце.

Сярод гасцей, якія ўдзельнічаюць штогод у нашым святе, студэнты з многіх ВНУ горада, сябры з Казанскага, Гомельскага Днепрапятроўскага, Адэскага універсітэтаў і нават з Балгарыі.

Урачыстасці, прысвечаныя свайму факультэту, сваёй прафесіі, праходзяць у нашым універсітэце на хімфаку, фізфаку, ФПМ. На гэтых факультэтах дні сталі не проста радасным святам, яны — даволі сур'ёзнае мерапрыемства, у якое ўцягнуты шырокія масы студэнтаў і выкладчыкаў. Дні выяўляюць ініцыятыву, мастацкую творчасць, нават артыстызм усіх прадстаўнікоў факультэта.

Пасвячэнне першакурснікаў у студэнты, медыум, прэс-канферэнцыя студэнтаў і супрацоўнікаў — вось тры кіты, на якіх трымаюцца дні мехмата. Няма патрэбы гаварыць аб папулярнасці гэтых мерапрыемстваў — актавая зала універсітэта перапоўнена ў час іх правядзення. Для ўсіх нас нашы дні — гэта перш за ўсё сродак больш глыбокага пазнання сябе, усяго калектыву факультэта.

Мы штодзень слухаем лекцыі, два разы ў год здаём сесіі, але амаль нічога не ведаем аб сваіх выкладчыках. На факультэце 1500 студэнтаў, а кола нашых знаёмых абмяжоўваецца звычайна групай або суседзямі па інтэрнату. Зразумела, канешне, што немагчыма блізка ведаць усіх 1500 студэнтаў і сто выкладчыкаў, але ж і мэта нашых дзён не ў гэтым. Мы лічым, што наша свята развівае пачуццё згуртаванасці, агульнасці, дачынення да калектыву, нарэшце, пачуццё гонару за свой факультэт.

У тых, хто быў на нашых прэс-канферэнцыях, думаю, не выклікае ўсмешкі сцвярджэнне, што яны збліжаюць студэнтаў і выкладчыкаў. Іменна тут можна лепш даведацца аб выкладчыку, з якім стольні разоў сустракаўся на лекцыях, заліках і экзаменах. Ды і аб кожным з нас у выкладчыкаў, думаю, складваецца больш пэўнае меркаванне як аб студэнтах, а не толькі як аб акадэмзапазычніках, «хвасцістах», выдатніках, серадняччках і інш. Менавіта таму прэс-канферэнцыю, як паказаў наш уласны вопыт і вопыт ФПМ, трэба дасканала падрыхтаваць. У гэтым годзе мы імкнёмся выправіць арганізацыйныя памылкі мінулых гадоў.

Аб значэнні пасвячэння першакурснікаў у студэнты шмат гаварыць не прыходзіцца. Мы лічым мэтазгодным пасвячаць першакурснікаў у студэнты іменна вясной, у час святкавання дзён мехмата таму, што ўжо пройдзен рубеж першай сесіі, якая з'яўляецца ўрэшце адзіным крытэрыем прыналежнасці да сям'і студэнтаў.

Медыум. Гэта своеасаблівая справаздача трэцякурснікаў, спроба ў непарыўным віры семестраў, сесій, будатрадаў, практыкі спыніцца, абдумаць, як жа пройдзена палова студэнцкага шляху, што чакае наперадзе.

Штогод узрастае ўклад у наша факультэцкае свята выкладчыкаў, і ў многім гэта заслуга дэкана мехмата, прафесара А. С. Фядэнкі, выкладчыкаў В. А. Пракашавай, У. Л. Ціхановіча.

Што датычыцца нашых праблем і цяжкасцей, то яны зводзяцца да аднаго: неабходны прыток новых людзей і новых ідэй. І калі першую цяжкасць можна вырашыць у межах факультэта, то другая патрабуе шырокага абмену інфармацыяй, ідэямі, вопытам правядзення святаў факультэта хаця б у маштабах універсітэта. Яе, як нам здаецца, павінен дапамагчы вырашыць студэнцкі клуб.

Мы запрашаем усіх жадаючых прыняць удзел і проста наведаць наш факультэт у час святкавання дзён мехмата.

В. КАЛЮТА,
член аргкамітэта дзён мехмата.

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА

# Камсамольская паверка

Выпускнік ВНУ сёння — гэта высокакваліфікаваны спецыяліст, умелы арганізатар, чулы выхавацель, чалавек актыўнай жыццёвай пазіцыі.

Неацэнную дапамогу ў падрыхтоўцы такіх спецыялістаў, у павышэнні актыўнасці камсамольцаў аказвае грамадска-палітычная практыка студэнтаў.

Прыняўшы да ўвагі памылкі і недахопы мінулага года, мы пачалі рыхтавацца да атэстацыі задоўга да яе правядзення. Ужо ў снежні пачалося фарміраванне атэстацыйных камісій, у састаў якіх увайшлі прадстаўнікі дэканата, партыйнай арганізацыі, камітэта камсамола і прафбюро.

У мэтах стварэння высокай маральнай атмасферы пры правядзенні грамадска-палітычнай атэстацыі мы вырашылі запрасіць ветэранаў партыі, камсамола, удзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў: А. С. Сакалова — члена КПСС з 1917 года, старшыню савета ветэранаў Маскоўскага раёна г. Мінска, І. М. Астаф'ева — члена КПСС з 1924 года, супрацоўніка УНК, Ф. Я. Дзянісевіча — члена КПСС з 1921 года, дэлегата XVI—XXIV з'ездаў КПБ і іншых.

У перыяд падрыхтоўкі да атэстацыі камітэт камсамола правёў дзве вучобы камсамольскага актыву факультэта, што дало свае станоўчыя вынікі.

Атэстацыя праходзіла ў святочна аформленых аўдыторыях.

У шматлікіх групах ГПА вылілася ў прынцыповую размову аб недахопах у рабоце камсамольскай арганізацыі факультэта, бюро груп і асобных камсамольцаў.

Так, напрыклад, група механікаў III курса на працягу цэлага семестра працавала дрэнна. Не праводзіліся пасяджэнні камсамольскага бюро, палова камсамольцаў групы не мела грамадскіх даручэнняў. Пасля атэстацыі работа ў групе прыкметна ажывілася. Усе студэнты атрымалі пастаянныя даручэнні, тры чалавекі працуюць у «Камсамольскім пражэктары» факультэта, група ўзяла шэфства над сельскай школай.

Газета, якую група выпусціла да 8 Сакавіка, заняла ў аглядзе-конкурсе другое месца і атрымала прыз.

Адзначыўшы высокі ўзровень арганізацыі і правядзення атэстацыі, мы хацелі б спыніцца на некаторых недахопах і расказаць аб тых шляхах, якія намечаны камітэтам камсамола факультэта для іх ліквідавання.

Па-першае, аказалася нявырашаным пытанне: як зрабіць, каб асабісты комплексны план кожнага студэнта стаў сапраўды планам удасканалення і выхавання высокакваліфікаванага маладога спецыяліста з актыўнай жыццёвай пазіцыяй? У ходзе ГПА гэтага года было выяўлена, што асабістыя комплексныя планы часта складаюцца студэнтамі, абмяркоўваюцца на камсамольскіх сходах фармальна. Таму камітэт камсамола, абмеркаваўшы вынікі атэстацыі, прыняў меры па ліквідаванню гэтага недахопу. У групах былі праведзены камсамольскія сходы па выніках атэстацыі і па пытаннях складання і прыняцця новых асабістых комплексных планаў.

Па-другое, хацелася б адзначыць недастаткова сур'ёзныя адносіны некаторых куратараў груп да правядзення атэстацыі. Не з'яўляючыся на вучобу, арганізаваную камітэтам камсамола БДУ, і не лічачы патрэбным вывучаць інструкцыі, якія маюцца, некаторыя куратары далёкія ад кампетэнтнага і прынцыповага падыходу да ацэнкі студэнтаў у ходзе заліку па ГПА.

Неабходна сказаць і аб якасці праведзенай у гэтым годзе камітэтам камсамола БДУ вучобы актыву. Хацелася б пачуць больш жывое абмеркаванне надзённых пытанняў, пагаварыць аб праблемах і знаходках у рабоце факультэцкіх арганізацый. Настала неабходнасць стварыць семінар па абмену вопытам правядзення заліку па грамадска-палітычнай практыцы.

А. ЖУК,
намеснік сакратара камітэта камсамола мехмата па ідэалагічнай рабоце.



Ідзе грамадска-палітычная атэстацыя.

# Не спыняцца на дасягнутым

Наша краіна жыве ў абстаноўцы разгарнуўшагася ўсенароднага спаборніцтва за ажыццяўленне рашэнняў XXV з'езда КПСС. Моладзь упэўненым крокам ідзе насустрач 60-годдзю Ленінскага камсамола, да свайго XVIII з'езда.

Нашай галоўнай задачай з'яўляецца вучоба, упартае, настойлівае авалоданне ведамі. Ленінскі запавет вучыцца быў і застаецца самым важным, самым актуальным ва ўсёй дзейнасці камсамола. Як жа абстаіць справа з паспяховасцю камсамольцаў нашага патока?

Нямала студэнтаў працуюць у паўсілы. Гэта тыя, хто любіць тройку. Да гэтай часткі камсамольцаў групавыя камсамольскія арганізацыі, бюро груп асабліва нецярпімы. Уважлівае вывучэнне дакументаў XVII з'езда ВЛКСМ нацэльвае нас на выхаванне глыбокага, устойлівага інтарэсу да вучобы. Рашэнне гэтай задачы патрабуе канкрэтнай дзейнасці ад кожнай арганізацыі: прыцягваць студэнтаў у навуковыя гурткі, праводзіць на факультэце дні навукі. У нас штомесячна праводзіцца вучоба акадэмсектараў, два разы ў месяц праходзіць праверка вучэбных дзённікаў груп. У кожнай групе арганізаваны кансультацыйныя пункты, пункты ўзаемадапамогі. Мы дабіваемся таго, каб кожны студэнт стараўся зразумець як мага болей, старанна працаваў над сабой. Але яшчэ па-ранейшаму перад намі стаіць задача: умець вучыцца, зберагаючы кожную мінуту. Хоць у акадэмічнай рабоце дасягнуты значныя поспехі, нам усё ж трэба павысіць сярэднюю паспяховасць патока з 3,83 да 4 балаў. На патоку ёсць з каго браць прыклад. Гэта нашы выдатнікі Л. Чыж (9 гр.), Н. Молчан (11 гр.) і Ж. Пунінская (10 гр.). Гэта і тыя камсамольцы, якім камсамольскія арганізацыі груп аказалі давер'е, назваўшы іх пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва за ганаровае права падпісаць Рапарт ЦК КПСС да 60-годдзя Ленінскага камсамола: В. Валынец (8 гр.), Л. Дубоўская (9 гр.), Т. Коўрык (10 гр.), В. Жукоўская (11 гр.), Т. Тарнагурская (12 гр.).

Адным з важнейшых абавязкаў камсамола з'яўляецца штодзённы клопат аб павышэнні якасці сваёй работы ў школе, аказанне дзейснай дапамогі педагогам у выхаванні піянераў і школьнікаў у духу ідэалаў і маральных прынцыпаў камунізму, сумленных адносін да вучобы і працы. І ў гэтай сувязі хочацца звярнуць увагу на работу шэфскага сектара нашай камсамольскай арганізацыі. Вялікая работа праведзена нашымі камсамольцамі-важатымі ў падшэфнай СШ № 80: у 4—5 класах арганізаваны гурткі юных матэматыкаў, праведзены гутаркі, сустрэчы з героямі Вялікай Айчыннай вайны і героямі працы, сустрэчы са студэнтамі БДУ.

На высокім ідэйна-палітычным узроўні праходзяць камсамольскія сходы патока. Успомнім апошнія нашы камсамольскія сходы на тэмы «Ніводнага адстаючага побач!», «Грамадска-палітычная атэстацыя і вынікі зімовай сесіі». На іх абмяркоўваліся самыя актуальныя, самыя наспеўшыя пытанні. Ніхто з камсамольцаў не пайшоў са сходу абыякавым да спраў групы, факультэта. Кожны камсамолец жыве і працуе пад дэвізам «Асабіста адказны», што азначае адказваць не толькі за сваю вучобу, але і за вучобу таварышаў.

Вялікая работа праводзілася па арганізацыйна-палітычнаму замацаванню ўсіх звенняў камсамольскай арганізацыі. Мы імкнёмся да таго, каб навучыць камсамольскі актыў асноўным пытанням тэорыі і практыкі камсамольскай работы. Рэгулярна, раз у два тыдні, праходзяць пасяджэнні камсамольскага бюро патока, раз у тыдзень выходзіць баявы лісток.

Зроблена шмат, але мы не маем права спыняцца на дасягнутым, супакойвацца. У нас яшчэ шмат нявырашаных пытанняў. Нам неабходна больш дакладна каардынаваць работу сектараў камсамольскіх арганізацый груп па аднаму з галоўных пытанняў — барацьбе за глыбокія і трывалыя веды. Нас да многага абавязвае і тое, што на базе нашага патока ствараецца СБА «Аурыка», які будзе працаваць у Малдавіі. Неабходна павысіць асабістую адказнасць кожнага камсамольца за палітычную адукацыю і самаадукацыю. Удзяліць больш увагі арганізацыі вольнага часу студэнтаў.

В. ГУСКО,
сакратар камсамольскага бюро III патока.

У. БЕЛЬСКІ

# ГЕОГРАФЫ

НАРЫС

(Заканчэнне. Пачатак у № 9, 10, 12).

### ЗВЫЧАЙНАЯ ГІСТОРЫЯ

Праходзіць міма гэтага нельга. Міма кахання. Пра яго пісалі, пішуць, будуць пісаць, пакуль не знікне чалавек, пакуль не выйдзе з грудзей яго апошні ўздых. Гэта бывае, відаць, усюды, калі нехта прыходзіць на заняткі дзеля некага іншага. Увесь час у думках разам з ім.

У думках... Вось яна прыйшла, села. Вось ён тут стаіць побач з табою, размаўляе, а ты... Ён, яна... Толькі сустрэнуцца поглядам, і — вочы ў дол, чырвань у твар. Перапынкі — цэлая вечнасць. Скончацца заняткі і тады... Тады кожны ідзе дамоў. І зноў усё спачатку.

Яны кахалі. Кахалі моцна, здаецца, больш ім нікога і нічога не было патрэбна. Яны ўдваіх. І ўсё. Усё? Не, далёка не ўсё. Я не буду гаварыць іх імёны, не трэба, гэта не так важна. Сапраўднае месца мела толькі гэта гісторыя.

Ён пакахаў яе, як заўсёды так здараецца, раптоўна. Рыхтаваліся разам да залікаў, экзаменаў. (Ён патрабаваў, каб яна вучыла ўсё, як кажуць, «на зубок»). А на занятках не хацеў, каб бачылі іх каханне, не хацеў, каб гаварылі пра яго. На сходах, перапынках мог кінуць у бок каханай калючае слова. «Хай бачаць, што я да яе, як да ўсіх!»

«Чем меньше женщину мы любим...» Ах, Пушкін! Гонар мужчыны. Гонар? Тут адразу не зразумееш, дзе гонар, а дзе слабасць. Яна не разумела. Не разумела нічога: ні яго адносін, ні яго самога. Спрабавалі падказаць. У запальчывасці кінула: «Сама вырашу ўсё!» Дзявочае сэрца трапятала, яно жадала нечага большага. Ці каханне гэта? Яна не магла адказаць нават самой сабе. Сустрэла іншага юнака. Выйшла замуж. Вось і ўсё.

Усё? Ён не ведаў, што рабіць. Кінуць групу, універсітэт? Яна тут, побач, і такая далёкая. На іх глядзелі, уся група, толькі дапамагчы нічым не маглі: рэці заўсёды лішні.

Знешне ўсё было, як заўсёды. Ён застаўся. Толькі балюча было бачыць яе кожную раніцу, кожны дзень, размаўляць і гаварыць не тое, што думаюць. Ён кахаў яе па-ранейшаму, моцна і горача, як кахаюць раз у жыцці. Яна. Яна кахала іншага. А іх каханне? Дзе яно? Не змаглі зберагчы?

...У групе выйшлі замуж амаль усе дзяўчаты. Адзвінелі камсамольскія вяселлі. У 40 гадоў куратар стала бабуляй.

Вучоба і каханне, каханне і вучоба — жыццё групы. Мы неяк не заўважаем гэтага перапляцення, імкнёмся прайсці міма. Нельга. Можна прайсці міма самога сябе, размінуцца з самім сабой і больш ніколі не сустрэцца. Вось і ўсё. Усё?..

### ЦЯГНІК ІДЗЕ НАПЕРАД

— Як мы занялі першае месца? Не ведаю. Па-мойму, і павінна было быць так, проста і шчыра.

— Пра яго ніхто не думаў. Тут справа не ў першым месцы, а ў жыццёвай пазіцыі, якую заняў кожны з нас.

— Я б яго аддаў нашаму куратару. Каб не яна, невядома, што б і атрымалася. Яна ў нас — не пабаюся высокага параўнання — «скульптар групы». Добры скульптар.

— Мне запомнілася практыка на Урале. Як зараз, бачу ўсю групу і... Людмілу Андрэеўну. У яе адпачынак быў, але яна паехала з намі за свае грошы.

— Цяжка разлучацца. Цяжка таму, што прывыклі, пасябравалі і таму, што знайшлі сябе, пабудавалі сапраўдную студэнцкую групу. Шкада, што гэтае прыйшло ў апошнія гады вучобы. На першых курсах не задумваліся аб такіх рэчах.

Яны сядзелі за сталом, падзшчячы перабіваючы адзін аднаго, расказвалі, расказвалі...

— Ой, а ў мяне сёння бегалі вучні па класе. Адзін з нейкай лямпай. Кажа, гэта лямпа Аладзіна!

— Я сёння двойку паставіла. Дзяўчаткі, страшна было. Я паставіла, а вучаніца заплакала. Мне так шкада яе...

— А я са сваімі ў валейбол гуляла. За каманду класа патрэбна было выступіць. Выйгралі... Якія ўсе шчаслівыя былі! А я забылася, што на практыцы, думала ў школу таксама хаджу. Смешна...

На стале ляжалі падручнікі, па якіх яны вучыліся сем гадоў назад, незакончаныя планы заняткаў. Праз некалькі месяцаў яны атрымаюць дыпломы.

Час праляцеў, і вось ужо цягнік падыходзіць да станцыі. Пара! Чарговая перасадка, і зноў у шлях. Зноў мільгаюць слупы, адлічваючы кіламетры-гады. Цягне наперад будучыня, нязведанае. У віхуры часу цяжка што-небудзь прыкмеціць. І ўрэшце нельга прыпомніць нават тую станцыю, на якой рабілі перасадку, суседзяў па купэ. У кішэні білеты — сведкі пройдзенага шляху.

Прайсці і не задумацца — гэта што жыць і не пражыць. Цікавае — вось яно, тут, побач з намі, а мы ідзём, часта топчам яго дзеля нечага цікавейшага наперадзе. А калі ў памяці толькі голы дзяркач успамінаў — значыць, яго не было, таго цікавага, да чаго так імкнуўся, значыць, ты тлеў у полымі жыцця. Назад... Назад? Туды не ідуць цягнікі лёсу, не пракладзена дарога.

Географы. Зямны шар — звычайны глобус. Рэкі — тонкія кіламетры нітак. Просты камень — цэлая гісторыя. Над усім — Чалавек, уладар усяго. Ён, як эстафету, нясе факел жыцця, перадае другому, трэцяму пакаленню. Гэта і ёсць неўміручасць яго жыцця. Бяссмерце чалавека.

Яны ўзялі гэты факел і павінны перадаць яго іншым. Асцярожна, каб не абпаліцца, не згарэць адразу, горш — не стлець.

Географы. Яны яшчэ не закончылі ВНУ. Вучацца і вучаць, перадаюць тое, што набылі тут, у сценах факультэта. Не закончылі, а ўжо мараць некалі сабрацца ўсёй групай, прыйсці да сваіх пераемнікаў, як зараз да іх прыходзяць вось ужо пяць гадоў запар былыя выпускнікі.

Задаў ім пытанне: ці згадзіліся б усё пачаць спачатку, улічваючы памылкі, набыты вопыт?

— Не... Усё сапраўднае — у непаўторнасці, паўсядзённым пошуку.

Географы. Ніткі рэк, люстры азёр. Чалавек. З вялікай літары...

## НАСУСТРАЧ СВЯТУ ПЕРАМОГІ



Набліжаецца светлае свята — Дзень Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэтай знамянальнай даце быў прысвечан дыспут па раману У. Багамолава «В августе сорок четвёртого...», які прайшоў на кафедры ваеннай падрыхтоўкі. У ім прынялі ўдзел чацвёртакурснікі факультэта журналістыкі, супрацоўнікі бібліятэкі БДУ Э. Ф. Міхалап і С. Г. Бадзялік, выкладчыкі ваеннай кафедры.

Дыспут выліўся ў цікавую размову аб гераізме і мужнасці савецкіх контрразведчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, аб неўміручым подзвігу ўсяго савецкага народа.

НА ЗДЫМКАХ: выступае Э. МІХАЛАП; уважліва слухаюць студэнты сваіх таварышаў; заключнае слова падпалкоўніка А. БЯДЭНКІ.

Фота В. ДРАЧОВА.





# «ЯК ЖЫВЁМ, ХЛЕБ ЖУЁМ»

## РЭЙД ГАЛАЎНОЙ ГРУПЫ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

Перад калектывам работнікаў прадпрыемстваў грамадскага харчавання універсітэта стаіць адказная задача — добра падрыхтавацца да вясновa-летняга сезону. А гэта азначае — своечасова адрамантаваць памяшканні і халадзільнае абсталяванне, навесці ўзорны санітарна-гігіенічны парадак.

Сучасная культура прадпрыемстваў грамадскага харчавання немагчыма без іх чысціні, бесперабойнай работы халадзільнага абсталявання, выканання правіл захоўвання і рэалізацыі харчовых тавараў. І таму невыпадкова, што ў ліку сацыялістычных абавязацельстваў калектыву ёсць пункты аб строгім выкананні санітарных правілаў і ўзорным ўтрымліванні ў чысціні кожнага рабочага месца. А як яны выконваюцца?

У сакавіку гэтага года мы праверылі буфеты і сталовыя універсітэта. Ва ўсіх іх выявілі тыя або іншыя грубыя парушэнні элементарных патрабаванняў санітарыі і гігіены. Не заўсёды строга выконваюцца рэкамендацыі папярэдніх праверак. Асобныя факты сведчаць аб тым, што кіраўніцтва ўпраўлення грамадскага харчавання няўважліва сочыць за санітарным станам падначаленых яму прадпрыемстваў. Вось, напрыклад, у сталовай галоўнага корпуса (загадчыца Т. І. Богуш) ранейшыя недахопы былі ліквідаваны толькі часткова. Пры чарговай праверцы выявіліся новыя недахопы. У халадзільнай камеры захоўвалася разам з рыбай замёрзлая гародніна. Пасудамыечная машына працуе ўсяго на адным маторы. Посуд прамываецца з парушэннем правілаў санітарыі і трапляе да студэнтаў не зусім чыстым. Адсутнічаюць гумавыя коўрыкі каля электрычных пліт на кухні. У варачным цэху дрэнная вентыляцыя. Хлеб наразаецца не ў спецыяльна адведзеным памяшканні. Пры ўваходзе ў сталовую ўстаноўлены, але не працуюць, 2 электрычныя сушылкі для рук.

**Не лепшая карціна і ў сталовай хімічнага корпуса (загадчык І. К. Карпач). У зале сталовай ракавіны умывальнікаў брудныя. Нездавальняюча вымыты посуд і не заўсёды якаснае прыгатаванне ежы выклікаюць справядлівыя нараканні з боку студэнтаў і супрацоўнікаў.**

**У сталовай № 33 (дырэктар В. В. Кулікова) заўважан зрух у станоўчы бок. Але не настолькі, каб можна было лічыць справу добрай. У кладоўцы сыпучых прадуктаў мяшкі з крупамі абы-як звалены ля сырой сцяны. Разам з крупамі захоўваюцца запалкі, шакалад, цыгарэты, разынкі. У варачным цэху ў работніц запэцканая спецвопратка, не маюць яны і індывідуальных ручнікоў. У абедзеннай зале не заўсёды ёсць на сталах сурвэткі, няма ні гарчыцы, ні перцу.**

У час праверкі посуд у сталовай быў дрэна вымыт, на лыжках і відэльцах пападаліся тлушчавыя плямы. І гэта не дзіўна. На наша пытанне аб правілах мыцця посуду ніхто з работніц не змог адказаць правільна. З 7 пунктаў рэжыму мыцця яны чамусьці карыстаюцца толькі двума-трыма.

У буфеце філалагічнага факультэта (буфетчыца Н. Ф. Балдышэўская) шафа для посуду знаходзілася ў антысанітарным стане. У падсобным памяшканні, дзе мыюць посуд, захоўваюцца булачкі, напітак і іншыя прадукты, што не адпавядае санітарна - гігіенічным нормам. Да мыечных ваннаў не падключана гарачая вада.

**Неабходна спыніцца на сталовых філіяла універсітэта ў Шчомысліцах. Працуюць там 2 сталовыя і буфет у інтэрнаце № 8. Кожная са сталовых абслугоўвае штодзённа не менш 320—350 чалавек. У суботу працуе толькі адна з іх да 15 гадзін. У нядзелю паесці можна толькі ў буфеце. Асартымент страў у гэтыя дні вельмі бедны. Камітэт камсамола факультэта радыёфізікі і электронікі стварыў мясцовы пост санінструктараў, які ўзначальвае дацэнт кафедры ЭФММ Г. Шпакоўскі. Члены паста неаднаразова ўказвалі на дрэннае санітарна-гігіенічнае становішча сталовых. Але заўвагі сістэматычна не выконваюцца, ігнаруюцца кіраўнікамі гэтых прадпрыемстваў. Без увагі засталіся сігналы студэнцкага паста і ў трэсце сталовых Кастрычніцкага раёна, якому падпарадкоўваюцца гэтыя сталовыя. У час праверкі сталовай «Гай» (загадчыца П. Л. Валасевіч) 15 сакавіка гэтага года санітарны пост адзначыў, што ў цэху халодных закусак знаходзіўся адначасова свежы і непрыгодны да ўжывання селядзец. Цэх апрацоўкі гародніны выкарыстоўваецца адначасова як сховішча бульбы, цыбулі і іншых прадуктаў. Ён захламлены: прадуктамі і тарай застаўлены праходы. Указаныя недахопы да гэтага часу не выпраўлены.**

У сталовай «Гай» выяўлены выпадкі разбаўлення таматнага соку вадой, за што повар Л. Дзюндзікава, якая парушала правілы разліву, строга пакарана.

Вось адна з найбольш тыповых скаргаў наведвальнікаў: «Хачу звярнуць увагу дырэкцыі трэста Кастрычніцкага раёна на пастаянны бруд у зале сталовай. Сталы тут заўсёды непрыбраныя, адсутнічаюць сурвэткі, посуд мыецца дрэнна (выпіска з кнігі скаргаў і прапаноў, 22 снежня 1977 г.)».

У буфеце інтэрната № 8 (буфетчыца Л. І. Апаровіч) не першы месяц стаіць сапсаваны халадзільнік. Яго рамонт павінна забяспечыць сталовая № 34. Але дырэкцыі сталовай да гэтага, відаць, няма справы. Іменна таму і ляжаць у кладоўцы буфета побач з іншымі прадуктамі зацвіўшыя рулеты, гародніна. А на цэментнай падлозе захоўваюцца кандытарскія вырабы.

Не працуе ў буфеце ўстаноўка падагрэву гарачых страў. На просьбы буфетчыцы адрамантаваць устаноўку дырэктар сталовай № 34 В. Д. Стасевіч адказвае толькі жартамі, а справа—ні з месца.

**Ёсць свае мінусы і ў рабоце буфетаў інтэрнатаў №№ 6, 7. Няма патрэбы пералічваць усе недахопы, выяўленыя ў час рэйдавай праверкі. Усе яны сведчаць аб тым, што кіраўнікам прадпрыемстваў грамадскага харчавання універсітэта неабходна тэрмінова прыняць неадкладныя меры да іх выпраўлення, каб кожная сталовая, буфет адказвалі патрабаванням высокай культуры.**

Але паспяхова выправіць становішча, якое склалася ва універсітэцкіх сталовых і буфетах, перашкаджае тое, што яны адносяцца да розных трэстаў. Ліквідаваць недахопы дапаможа, на наш погляд, падпарадкаванне сталовых і буфетаў універсітэта аднаму трэсту ці стварэнне свайго асабістага камбіната грамадскага харчавання.

**Рэйдавая брыгада:**
**М. КАВАЛЁЎ — член сектара быту ГНК БДУ;**
**Р. МІХНЕВІЧ — член сектара быту ГНК БДУ;**
**А. ГАРУЛЁВА — урач палiклінікі БДУ;**
**М. КУРГАНСКІ — член штаба «КП» камітэта камсамола.**




**У сувязі з днямі мехмата, якія набліжаюцца, сёння ў гасцях у «Кафедры агульнага смехаробства» — «РЛЗ» («Рошым любую задачу») — насценгазета механіка-матэматычнага факультэта.**

**Што такое насценгазета? Зразумела, гэта газета, якая вісіць на сцяне. Але, акрамя таго, газета, якая вісіць на сцяне, становіцца насценгазетай тады і толькі тады, калі яе чытаюць, прычым не проста так, а з цікавасцю. Хто чытае студэнцкія насценгазеты? Статыстычныя даследаванні паказваюць, што асноўная маса чытачоў — гэта: а) прагульшчыкі, б) людзі з іншых факультэтаў, в) тыя, каму ў дадзены момант няма чаго рабіць, г) яшчэ нейкія людзі.**

**Што такое гумар? Непрафесіяналы думаюць, што гумар — гэта тое, што смешна. (Прафесіяналы сцвярджаюць, што гумар — гэта тое, што нараджаецца ў пакутах). Што неабходна для таго, каб гумар дайшоў? Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што для гэтага дастаткова, каб гумар быў на ўзроўні. Мы лічым, што гэтага недастаткова. Чытач таксама павінен быць на ўзроўні.**

**Такім чынам — «РЛЗ»!**




Прайшло шмат год з тае пары, калі Курант і Робінс паставілі гэтае пытанне. Але мала што змянілася. Школьнікі думаюць, што матэматыка — гэта падручнік пад рэдакцыяй Калмагорава (Качаткова або Магніцкага). Фізікі думаюць, што матэматыка — гэта дыферэнцыяльныя ўраўненні. Сацыёлагі думаюць, што матэматыка — гэта статыстыка. Праграмісты наогул нічога не думаюць — так лягчэй праграміраваць.

Але ўсе яны думаюць, што ведаюць, што такое матэматыка. Матэматык так не думае. Ён прама гаворыць: «Не ведаю!» Як паказвае практыка, гэта фраза гаворыцца часцей за ўсё на экзамене. Але размова не аб гэтым, а аб тым, што ж такое матэматыка? Ну што ж. Як гавораць аматары матаналізу, будзем інтэгрыраваць па частках.

1. Вышэйшая алгебра. Асноўная тэма — мнагачлены. Назва ўзяла пачатак ад біялагічнага тэрміна «членістаногія», які дае даволі дакладнае ўяўленне аб вывучаемым прадмеце.




2. Матаналіз. Вытворныя, рады, інтэгралы, інтэгралы, інтэгралы, экзамен.

3. Аналітычная геаметрыя і лінейная алгебра. Тое, што лінейная алгебра зробіць з аналітычнай геаметрыяй у другім семестры, не змяшчаецца ні ў якія рамкі дэкартавых каардынат.

4. Дыферэнцыяльныя ўраўненні. Гэта галіна праславілася тым, што цалкам вычэрпваецца аднэй адзінай тэарэмай Пікара.

5. Тэарэтычная механіка. Першае пытанне, якое ўзнікае, — чым яна адрозніваецца ад механікі? Адказ: простая механіка на практыцы здзяйсняе тое, што не можа даказаць тэарэтычная.

6. Фізіка. Як ужо гаварылася, суцэльныя дыферэнцыяльныя ўраўненні.

7. Дыферэнцыяльная геаметрыя. Гэта крывізна і кручэнне. У выніку курс закручваецца так, што адкруціць яго ўжо немагчыма, прыходзіцца здаваць экзамен.

8. Тэорыя верагоднасцей. Чыста прыкладная навука. Дапамагае пры гульні ў прэферанс.

9. Т. Ф. К. П. Зноў рады. Зноў інтэгралы. Зноў экзамен.

10. Метады вылічэнняў. Розніца універсітэцкага курса. Праўда, зусім не салодкая. Тым не менш, калі вы ведаеце формулу Тэйлара, баяцца няма чаго.

11. Функцыянальны аналіз. Яшчэ адна розніца. Праўда, пабуйней. 41 лекцыя. Тыя, хто праслухаў увесь курс, атрымліваюць залаты значок ГПА.

12. Ураўненні матэматычнай фізікі. Кульмінацыя ўсяго універсітэцкага курса. Таксама 41 лекцыя. Калі вы разабраліся хаця б у палове, значыць, «каэфіцыэнт інтэлектуальнасці» ў вас не ніжэй 200.

Цяпер, здаецца, вы зразумелі, што такое матэматыка?




● **НЕ ПОДКАЧАЛИ!** Пенсионер Ф. Малининг попросил проходивших мимо студентов мехмата подкачать спустившееся колесо «Запорожца». Молодежь не подкачала!

● **УЧЕНЫЙ ПРИНОСИТ ПОЛЬЗУ.** Известный ученый Дотошкин, долго ломавший голову над одной важной проблемой, добился, наконец, этой цели.

● **ПРОИСШЕСТВИЯ.** Вчера в общежитии № 7 работал лифт. Причина не установлена.

● **ВЫПИСКА ИЗ ПРИКАЗА.** За посещение лекции по педагогике без уважительных причин студенту Коле Ф. объявляется благодарность.

● **ПОЛЕЗНЫЕ СОВЕТЫ.** Переходя улицу на зеленый свет, можно сэкономить от 3 до 10 рублей.

● **ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ЧТО...** незнание иностранных языков значительно сокращает время обучения в университете?

● **НОВОСТИ СПОРТА.** Студент Петя В. побил университетский рекорд по посещаемости. За неделю он пропустил 46 часов — на 4 часа больше, чем ближайший соперник, и на 2 часа больше, чем стоит в расписании.

● **«ЭХ, ПРОКАЧУСЬ!»** — подумал Жора Щ., подходя к лифту главного корпуса. Дальнейшая судьба храбреца неизвестна.

## ПЕСЕННИК РЛЗ

1. «Не обижайте любимых упреками» (Отелло).

2. «Мой конь притомился, стоптались мои башмаки» (Медный всадник).

3. «Я могла бы убежать за поворот» (Красная Шапочка).

4. «Нас утро встречает прохладой» (студенты, проживающие в общежитии № 7).

5. «Не везет мне в смерти, повезет в любви» (Кащей Бессмертный).

6. «На тебе сошелся клином белый свет» (руководитель физпрактикума по оптике).

7. «Надоело говорить и спорить, и глядеть в усталые глаза» (экзаменатор).

8. «От улыбки станет всем теплей» (синоптик).

## ? ? ? ? ? ? НА ВЁСКУ ДЗЯДУЛІ

Ванька, девятнадцатилетний мальчик, поступивший четыре месяца назад в ученье, в ночь под рождество не ложился спать. Дождавшись, когда все уйдут на новогодний вечер, он достал из тумбочки пузырек с чернилами, ручку с автоматическим пером и, разложив перед собой измятый лист бумаги, стал писать.

«Милый дедушка Константин Макарыч! — писал он. — И пишу я тебе письмо. Поздравляю тебя с рождеством и желаю тебе всего хорошего».

Ванька вздохнул, макнул перо и продолжал писать: «А вчера мне выволочка была. Ответственный по коридору выволок меня из комнаты и заставил мыть ихний коридор. А на неделе велели мне на практических занятиях график построить, а я не с того конца начал, студенты надо мной через это насмехаются.

А еды нету перед стипендией никакой. Утром хлеб, в обед каша, вечеру опять хлеб, а чтоб колбасы там или мяса, то на это не хватает. Милый дедушка, сделай божескую милость, возьми меня отсюда на деревню, нету никакой моей возможности. Или деньжонок подкинь, а то помру.

Приезжай, милый дедушка, пожалей ты меня, сироту несчастную, а то матанализ меня совсем замучил. И по алгебре лекции такие, что и сказать нельзя, все плачу. А намедни начитался лекций по топологии, так что упал и насилу очухался. Пропащая моя жизнь, хуже всякой».

Ванька сложил вчетверо исписанный лист, вложил его в конверт, почесал затылок и стал старательно выводить адрес: «На деревню дедушке...»




**20 апреля, четверг.**

8.30. Манифестация, посвященная открытию «Дней мехмата-78».

13.35. Футбольный матч «Красный пролетарий» (преподаватели) — «Кристалл» (студенты) — на стадионе БГУ.

18.30. «Посвящение первокурсников в студенты» — актовый зал.

**21 апреля, пятница.**

13.35. Мемориал памяти Адама Козлевича. Турнир по домино. Ауд. 433, гл. корпус.

14.00. Соревнования по женскому мини-футболу на приз «Трёх граций», посвященные чемпионату мира в Аргентине — спортзал.

16.30. Товарищеская встреча по волейболу между студентами и преподавателями — спортзал.

18.00. Фестиваль искусств «В театральной гостиной мехмата» — актовый зал.

**22 апреля, суббота.**

14.00. Пресс-конференция «Студенты-преподаватели» и «Преподаватели-студенты» — актовый зал.

18.00. «Медиум» третьекурсников.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 03181 Тыраж 2000 экз. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 608.